увазе і падтрымцы дзяржавы, якую мы сёння адчуваем. Мы марым, каб "Вясёлачка" трапіла ў кожную хату, дзе ёсць дзеткі.

**Уладзімір Сцяпанавіч, зразумела, што праца ў часопісе дае багата матэрыялу для вашай пісьменніцкай працы.**

Канешне, калі гаварыць у асабістым плане, то мае кніжкі "Падкідыш", "Бацькі і дзеці", "Адпяванне жывых", "Я", "Мама" — вынік шматгадовых разважанняў над праблемамі дзяцінства, уражанняў ад шматлікіх сустрэч з дзецьмі, падрабязнага знаёмства з іх праблемамі. Апошняя мая кніжка "Мама" нарадзілася менавіта на гэтай глебе. Сёння, калі бачыш маладых мам, некаторыя з якіх кідаюць сваіх дзетак, з асаблівай удзячнасцю ўспамінаеш сваю маці, непісьменную, святую.

**Застаецца спадзявацца, што творы беларускіх літаратараў, у тым ліку і вашы, дапамогуць аднавіць духоўнасць як важнейшы прынцып выхавання падрастаючага пакалення. Думаю, што гэтаму ж спрыяе і ваша дзейнасць у якасці старшыні Беларускага дзіцячага фонду. Скажыце колькі слоў аб гэтай рабоце. Нашым настаўнікам будзе цікава даведацца аб ёй больш падрабязна.**

Дзіцячы фонд дзейнічае ўжо 12-ы год. Увесь гэты час я працую яго старшынёй. І ўжо прызвычаіўся растлумачваць, што Дзіцячы фонд — гэта не тая ўстанова, дзе раздаюць бясплатныя цукеркі ды арганізуюць забаўляльныя выезды за граніцу. Дзіцячы фонд — гэта пастаянная і мэтанакіраваная работа па самых розных праграмах, прысвечаных набалелым праблемам дзяцінства.

Увесь час мы стаім на абароне дзяцей, якія трапілі ў бяду. Па-першае, гэта, канешне, праграма "Дзеці Чарнобыля". Цяпер рэалізуецца спецыяльная падпраграма "Дзеці-інваліды Чарнобыля". Дарэчы, 1,5 тысячы дзяцей маюць такія пасведчанні. Кожнае лета мы вывозім іх на Нарач, дзе праводзім спецыяльную змену "Вясёлка" надзеі". У час аздараўлення на прыродзе дзеткі маюць магчымасць пазнаёміцца, абмяняцца адрасамі, пасябраваць.

Што яшчэ мы робім? Ну, вось за гэтыя гады вывезлі 70 беларускіх дзетак, якім патрэбны былі вельмі складаныя і дарагія аперацыі на сэрцы, у ЗША. Гэтыя аперацыі ім былі зроблены бясплатна. Лічу, што толькі за адно гэта наша сумленне можа быць чыстым перад Богам.

Мы, супрацоўнікі Беларускага дзіцячага фонду, першымі адкрылі дарогу да дзіцячых дамоў-інтэрнатаў. Мы першымі зрабілі адпаведны даклад, накіравалі ў гэтыя дамы шматлікіх спонсараў.

Акрамя таго, мы арганізавалі шэфства каля 400 замежных спонсараў над канкрэтнымі дзецьмі-сіротамі.

Я ўжо расказваў і пра нашу праграму "Таленавітыя дзеці", у рамках якой праводзім шматлікія семінары, сустрэчы, канцэрты, выставы, паездкі.

Падкрэслю яшчэ раз, што галоўная наша задача — абараняць правы дзіцяці. Між іншым вось тут, у гэтым кабінеце, за гэтым сталом, быў напісаны першы варыянт Закона аб правах дзіцяці. Мы два гады працавалі ў спецыяльнай камісіі Вярхоўнага Савета, дапрацоўваючы гэты Закон. Потым арганізавалі і правялі два пасяджэнні дзіцячага парламента. Гэта было вельмі цікава. Вось і цяпер я выступіў з ініцыятывай 1 чэрвеня, у Дзень абароны дзяцей, запрасіць іх у Авальную залу, а каб мы, дарослыя, дэпутаты, пісьменнікі, палітыкі, пасядзелі на балконе і паслухалі, што скажуць нашы дзеці.

**"Устами младенцев глаголет истина"? Вы гэта хочаце сказаць?**

Так, менавіта. У дзяцей погляд на свет наіўны, але ён па сутнасці сваёй адзіна правільны. Трэба ўмець пачуць голас дзятвы. Я гавару аб гэтым, калі звяртаюся з адкрытым лістом да Прэзідэнта з прапановай стварыць спецыяльную праграму "Дзеці Беларусі". Хачу адзначыць, што дзякуючы нашай ініцыятыве такая праграма была створана і цяпер дзейнічае, пад яе выдзелены немалыя грошы.

**Скажыце, Уладзімір Сцяпанавіч, ці могуць звяртацца да вас асабіста ці ў Дзіцячы фонд нашы настаўнікі?**

Зразумела, калі ёсць пытанні, праблемы, калі ласка. Як старшыня Беларускага дзіцячага фонду, член нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці, галоўны рэдактар "Вясёлкі" я атрымліваю шмат пісем, зваротаў ад дарослых і дзяцей, што трапілі ў бяду. І заўсёды імкнуся дапамагчы.

**Дзякуй вам за гутарку, Уладзімір Сцяпанавіч. Здароўя вам і творчых поспехаў на карысць беларускіх дзяцей, дзеля нашай будучыні.**



# АДКРЫЙЦЕ МАЦЮШКІНА

Напэўна, ні адна сфера чалавечай дзейнасці так не падвержана расчараванню, як адукацыя. Толькі на маім педагагічным вяку адшумелі і сцерліся з памяці такія знакамітыя надзеі, як ліпецкі метад і педагогіка супрацоўніцтва, калектыўнае навучанне і калектыўнае творчае выхаванне. Ціха дажываюць там-сям невядома якім ветрам сюды занесеныя прыёмы непараўнальнай Марыі Мантэсоры і таямнічага Рудольфа Штайнера. Усё прымае гэта зямля, і нічога на ёй не прыжываецца.

Па маіх назіраннях, любая педагагічная навінка ў нас у краіне рэалізуецца па такой схеме: чутка — масавае захапленне — масавы скепсіс. Прычым часта адбываецца так, што нават прадмет расчараванасці ўстанавіць удаецца з вялікімі цяжкасцямі. Не ведаю, ці пазнаў бы В. В. Давыдаў у беларускіх інтэрпрэтацыях развіццёвага навучання сваё дзецішча, а вось ацэнка нібы яго творчасці ў выглядзе першых сімптомаў незадаволенасці ўжо з'явілася. "Нічога асаблівага ў гэтым развіццёвым навучанні няма, — кажа мне аўтарытэтны педагагічны чыноўнік, — мы ўвялі яго ў розных раёнах рэспублікі і атрымалі вынік намнога горшы, чым у звычайных школах". Чарговае расчараванне.

Шматпакутны лёс педагагічных наватарый у нашай школе наводзіць на думку аб існаванні нейкай недасканаласці ў механізмах абнаўлення адукацыйнага вопыту. Можна нават прапанаваць да публічнага абмеркавання наступную гіпотэзу: спосабы і механізмы ўдасканальвання педагагічнай практыкі, якія існавалі раней, грунтаваліся на капіраванні адносна простых яе форм. Сучасныя ж развітыя сістэмы педагагічнай дзейнасці не перадаюцца пры дапамозе ранейшых механізмаў пераймання, а патрабуюць арганізаванай працэдуры запазычвання, напрыклад, пры дапамозе спецыяльна арганізаванага навучання кіраўнікоў навучальных устаноў, настаўнікаў і выхавальнікаў. У адваротным выпадку адбываецца скажэнне набываемага вопыту і, як вынік, прыходзіць расчараванне.

Акрамя таго, як мне здаецца, у грамадскай свядомасці склаліся крайне спрошчаныя ўяўленні аб педагогіцы і педагагічнай рабоце. Лічыцца, што ў гэтай галіне чалавечай практыкі ўсе ледзьве не з нараджэння спецыялісты. Распаўсюджванню гэтай прадузятай думкі нямала спрыяе і паспяховае выхаванне дзяцей у некаторых сем'ях, дзе, як кажуць, "універсітэтаў не канчалі". Вопыт жа няўдач ігнаруецца, яго прынята спісваць на фатальны ўплыў недабраякаснага асяроддзя.

Можа быць, нізкі грамадскі статус нашага настаўніцтва якраз і звязаны з гэтым спрошчаным поглядам на адукацыю? І ці не спрыяем мы самі, дарагія педагогі, распаўсюджванню і ўмацаванню гэтых стэрэатыпаў, калі павярхоўна адносімся да адукацыйных навін, не абцяжарваючы сябе пранікненнем у іх сутнасць? Такім чынам мы прафануем уласную справу.

Сёння на нашай выстаўцы экспануецца айчыннае псіхолага-педагагічнае вынаходства — праблемнае навучанне А. М. Мацюшкіна. У канцы 70-х гадоў педагагічная практыка, уволю нацешыўшыся прапанаваным вучоным метадам навучання школьнікаў і, натуральна, расчараваўшыся ў ім, перадала яго ў архіў. І гэта тады, калі ў школе ні дня не праходзіла і не праходзіць без адкрытага прымусу, калі нежаданне дзяцей вучыцца набывае характар пандэміі і калі каштоўнасць адукацыі праблематычная нават для саміх настаўнікаў.

У пошуку выйсця з тупіковай сітуацыі караваны педагагічных работнікаў адпраўляюцца ў далёкія краіны за чароўнымі сродкамі. А побач, тыражаваны і складзіраваны ў бібліятэчных бамбасховішчах, чакае свайго макулатурнага нажа унікальны вопыт нямецкіх гештальт-псіхолагаў, бліскуча інтэрпрэтаваны іх савецкім калегам.

Квінтэсенцыя метаду, калі верыць аўтару артыкула В. Герасімавай, заключаецца ва ўменні педагога ствараць на ўроку праблемныя сітуацыі. Праблемная сітуацыя вучня характарызуецца "стратай арыентацыі, адсутнасцю ўстойлівых алгарытмаў мыслення і дзейнасці". Чалавек у такім стане доўга знаходзіцца не можа. Ён адчувае сябе дыскамфортна і, імкнучыся да праяснення сітуацыі, пачынае самастойны пошук прычыны цяжкасцей. Гэты псіхалагічны прыём — ключ да матывацыі вучэння, яе неабходная ўмова.

Неабходная, але ці дастатковая? Давайце з гэтым не спяшаючыся разбяромся.

А. ПАЛОННІКАЎ,
вядучы рубрыкі.